*А. Ю. КАЗЛЕНКА*

# ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПЕРСАНАЛЬНАЙ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

*Упершыню абгрунтавана мэтазгоднасць выкарыстання паняцця “функцыянальны патэнцыял” у адносінах да бібліяграфічнай інфармацыі. Даказана неабходнасць далучэння да спіса агульнапрынятых функцый персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі гісторыка-культурнай, крыніцазнаўчай і функцыі адлюстравання ўзаемасувязей навукова-адукацыйнага комплексу.*

Паглыбленне інфарматызацыі грамадства абумоўлівае рост цікавасці да бібліяграфічнай інфармацыі як крыніцы інтэнсіўнага згортвання ведаў. Любая інфармацыя патрабуе лагічнай упарадкаванай сістэмы размяшчэння, якая неабходна дзеля яе хуткага пошуку і выкарыстання. Адным са спосабаў лагічнага ўпарадкавання біяграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі з’яўляецца персанальная бібліяграфічная інфармацыя[1].

Прыярытэт выданняў аб персаналіях у сістэме патрэбнасцей навукі адзначаўся заўсёды. Каля двух стагоддзяў складвалася ў Беларусі шырокая персанаграфія. Амаль ва ўсіх відах бібліяграфічных паказальнікаў прысутнічае персанальны аспект: асоба адлюстроўваецца ў персанальных бібліяграфічных паказальніках, у персанальных раздзелах галіновых паказальнікаў, у краязнаўчых бібліяграфічных паказальніках, біябібліяграфічных слоўніках і г. д. Персанальная бібліяграфічная інфармацыя забяспечвае ўсебаковае і аб'ектыўнае даследаванне жыцця і творчасці дзеячаў навукі, культуры, адукацыі, значна палягчае стварэнне твораў біяграфічных жанраў, а таксама аказвае істотную дапамогу ў развіцці гісторыі навукі і практыкі. Акрамя таго, як вынік вузкіх спецыялізацый дзеячаў навукі і культуры, чыя інтэлектуальная творчасць адлюстравана ў персанальных бібліяграфічных матэрыялах, персанальная бібліяграфічная інфармацыя часта замяняе тэматычную і забяспечвае спецыялістаў актуальнай бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыяй па малараспрацаваных тэмах, запаўняючы лакуны ў інфармацыйных сістэмах.

Пры вывучэнні феномена бібліяграфіі даследчыкі шмат увагі надаюць вывучэнню яе грамадскага прызначэння – функцыям бібліяграфіі і бібліяграфічнай інфармацыі. Прадстаўнікі розных падыходаў (кнігазнаўчага, дакументаграфічнага, кагнітаграфічнага, культураграфічнага, ідэаграфічнага) прапаноўваюць свае функцыянальныя структуры бібліяграфічнай інфармацыі. Аднак сістэмна не выяўлены і не распрацаваны функцыі асобных відаў бібліяграфічнай інфармацыі, у прыватнасці персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі, што шмат у чым марудзіць яе стварэнне і рознааспектнае выкарыстанне. Пры вылучэнні функцый персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі неабходна мець на ўвазе функцыі бібліяграфічнай інфармацыі ўвогуле, таму што, нягледзячы на адносную самастойнасць персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі, яна з’яўляецца і неад’емнай часткай бібліяграфічнай інфармацыі, функцыі якой усё ж такі будуць асноўнымі і для персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі. Так, згодна з дакументазнаўчым падыходам [2], для персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі характэрны ўнутраныя функцыі бібліяграфічнай інфармацыі: пошукавая, камунікатыўная, ацэначная. Не менш важнымі для персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі з’яўляюцца знешнія функцыі бібліяграфічнай

[1] Паняцці “персанальная бібліяграфічная інфармацыя”, “персанальная бібліяграфія”, “бібліяграфічная інфармацыя” і “бібліяграфія” ў артыкуле выкарыстоўваюцца як раўназначныя, таму што прынцыповых адрозненняў у іх змесце няма. Гэтыя тэрміны можна лічыць сінонімамі, паколькі ўсе яны азначаюць бібліяграфію аб персонах. Улічваючы шматзначнасць тэрміна “бібліяграфія”, выкарыстоўваецца адно з яго сутнасных і ўстойлівых значэнняў, дзе бібліяграфія разумеецца як сукупнасць бібліяграфічных прац, выдзеленых паводле пэўнай прыметы. Але найбольш дакладным мы лічым тэрмін “персанальная бібліяграфічная інфармацыя”, які адлюстроўвае як відавую спецыфіку разглядаемага аб'екта, так і яго непасрэдныя адносіны да інфармацыйных рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі: садзейнічанне навукова-тэхнічнаму прагрэсу, сацыялізуючая, культурна-асветніцкая, адукацыйная [5].

Традыцыйна персанальная бібліяграфічная інфармацыя разглядаецца як другасная, як вынік аналізу і сінтэзу першаснай інфармацыі. Сучасныя даследчыкі ўсё часцей вылучаюць персанальную бібліяграфічную інфармацыю як самагодную з’яву культуры і адзначаюць яе крыніцазнаўчую, сацыяльна-культурную, гісторыка-культурную функцыі. У публікацыях апошніх гадоў персанальная бібліяграфічная інфармацыя разглядаецца як метад вывучэння гісторыі бібліятэчнай справы [4], як крыніца краязнаўчых даследаванняў [3] і інш. Становяцца актуальнымі вылучэнне новых функцый персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі, кірункаў выкарыстання і вывучэнне яе патэнцыялаў.

Аднак важна разумець адрозненне паміж функцыямі і функцыянальным патэнцыялам. Так, найбольш простае вызначэнне функцыі вынікае з паходжання гэтага слова ад лацінскага *functio* – выкананне, ажыццяўленне. У шырокім сэнсе “функцыя” – гэта праяўленне ўласцівасцей аб’екта, якое заключаецца ў яго ўздзеянні на змяненне стану іншых аб’ектаў.

Мастацтвазнавец Ю.Дружкін [1] вылучыў паняцце “функцыянальны патэнцыял”, пад якім разумеў комплекс патэнцыяльных магчымасцей аб’екта аказваць пэўнае ўздзеянне на нейкую сістэму. Гэты прастор магчымасцей структуруецца ў адказ на з'яўленне трох іншых элементаў: карыстальніка, задач і тэхналогіі.

Нам падаецца мэтазгодным пры вывучэнні функцый і магчымасцей персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі выкарыстоўваць менавіта паняцце “функцыянальны патэнцыял”. Гэтае паняцце дазваляе не толькі прывесці пералік функцый персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі з перспектывай яго папаўнення, але і разгледзець магчымасці іх аптымальнай рэалізацыі.

У розных канкрэтных выпадках, згодна з рознымі патрэбнасцямі карыстальнікаў, будуць уяўляць значнасць розныя складаемыя функцыянальнага патэнцыялу персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі. У адпаведнасці з гэтым галоўным прадметам становіцца не інтэгральная цэласнасць сістэмы функцый персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі, а магчымасць выбіральнага выкарыстання тых ці іншых асобных яе элементаў або іх камбінацый. Функцыянальны патэнцыял будзе выяўлены і рэалізаваны па-рознаму ў залежнасці, па-першае, ад намераў (запытаў) карыстальніка і, па-другое, ад асаблівасцей яго самога або тых, на каго ён мае намер накіраваць дзеянне тых функцый, якія характэрны для персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі.

Улічваючы магчымасць распрацоўкі функцыянальнага патэнцыялу персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі, трэба адзначыць, што персанальная бібліяграфічная інфармацыя – гэта не проста сукупнасць паказальнікаў, спісаў, баз даных, хоць яны з'яўляюцца яе элементамі. Персанальная бібліяграфічная інфармацыя па сваёй сутнасці ёсць арганічная частка культуры. Гэтая інфармацыя, як і бібліяграфічная інфармацыя ўвогуле, апасродкавана адлюстроўвае духоўныя запыты грамадства, дамінанты розных культурных этапаў, іх псіхалагічную атмасферу, дае багаты матэрыял для меркаванняў аб грамадскіх інтарэсах і густах. Як усякая гістарычная крыніца, персанальная бібліяграфічная інфармацыя нясе на сабе адбітак тых умоў, у якіх яна ствралася, і адлюстроўвае гэтыя ўмовы.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што персанальная бібліяграфічная інфармацыя мае сваім апасродкаваным аб’ектам сукупны працэс развіцця навукі, культуры, мастацтва, адукацыі краіны або свету. Гэты вывад сведчыць аб магчымасці пашырэння функцыянальнага патэнцыялу персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі і далучэння гісторыка-культурнай, крыніцазнаўчай і іншых функцый да спіса агульнапрынятых.

Персанальная бібліяграфічная інфармацыя як від бібліяграфічнай інфармацыі дазваляе зарыентаваць карыстальніка ў гісторыі навук, культуры і даць асноўныя біябібліяграфічныя звесткі аб вядучых іх прадстаўніках. Жыццяпіс у выданнях персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі будуецца на аснове сінтэзу прыёмаў вобразнага адлюстравання асобы з элементамі бібліяграфічнай характарыстыкі яе творчасці. Абагульняючы вынікі дзейнасці асобных дзеячаў, фарміруючы нябачны калектыў вызначанага профілю, персанальная бібліяграфічная інфармацыя прама або ўскосна, з аднаго боку, персаніфікуе дасягненні ў разнастайных напрамках грамадскага жыцця,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукі і культуры, а з іншага боку, удзельнічае ў апісанні сукупнага працэсу культурна-гістарычнага развіцця дзяржавы.

Праз біяграфію і бібліяграфію персанальная бібліяграфічная інфармацыя далучае карыстальніка да кола каштоўнасцей мінулага і сучаснага, фарміруе на гуманістычнай аснове культуру чалавека, яго самастойнае мысленне.

У Рэспубліцы Беларусь большая частка самастойных персанальных бібліяграфічных паказальнікаў – навукова-дапаможныя, у іх выхаваўчая функцыя выражана не яскрава. Аднак ускосна, праз факты жыцця, пералік прац тых ці іншых асоб, водгукі, гэтыя паказальнікі таксама выхоўваюць у чалавека гонар за Радзіму, за беларуса, наогул людзей нашай краіны. Яны накіроўваюць чалавека на дасягненні, падобныя дасягненням таго беларуса, якому прысвечаны не толькі артыкул у энцыклапедыі, але і самастойнае персанальнае бібліяграфічнае выданне.

Крыніцы персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі прызначаны садзейнічаць павышэнню ўзроўню культуры карыстальнікаў у шырокім сэнсе: культуры духоўнай, палітычнай і эканамічнай, экалагічнай, мастацкай, культуры зносін і культуры чытання. Яны накіраваны на распаўсюджанне ведаў, фарміраванне асобы сучаснага чалавека, здольнага на аснове духоўных багаццяў, якія назапашаны чалавецтвам і выдатнымі прадстаўнікамі яго Радзімы, выпрацаваць сваю жыццёвую пазіцыю.

У функцыянальным патэнцыяле персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі можна вылучыць і спецыфічную функцыю адлюстравання ўзаемасувязей навукова-адукацыйнага комплексу, што дэтэрмінавана унікальнымі яго элементамі і сувязямі. Пад паняццем “навукова-адукацыйны комлекс” мы разумеем сістэму ўзаемасувязей паміж навукай і адукацыяй, якія выражаны ў іх канцэптуальным, метадычным і арганізацыйным узаемадзеянні. Так, Р.М.Юсупаў прапануе наступную структуру навукова-адукацыйнага комплексу.




Згодна з вызначанай структурай, асноўная мэта навукі – ствараць новыя веды (I), на якія абапіраецца і адукацыя ($I_1$), задача вышэйшай адукацыі – рыхтаваць кваліфікаваныя кадры (К), у тым ліку і для сферы навукі ($К_1$). Унутры сістэмы “навука–адукацыя” маюцца ўнутраныя патокі $I_2$ і $К_2$, якія характарызуюць адпаведна ўклад навукі вышэйшых навучальных устаноў у агульную навуку і ўдзел навуковых супрацоўнікаў у падрыхтоўцы спецыялістаў [6, с. 14–15].

Кадравы патэнцыял з’яўляецца адным з найбольш устойлівых элементаў узаемасувязі навукі і адукацыі. Пры стварэнні персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі, прысвечанай дзеячам навукі і адукацыі, неабходна, акрамя агульнапрынятых элементаў, улічваць гэтую сувязь і адлюстроўваць яе ў біяграфічнай і бібліяграфічнай частках, а таксама дадаваць у іх структуру новыя элементы: адносіны да той ці іншай навуковай школы, навуковае кіраванне аспірантамі, суіскальнікамі, рэферэнтную групу прадстаўніка навукова-адукацыйнага комплексу, яго апанентнае кола.

Гісторыка-культурным, крыніцазнаўчым і выхаваўчым патэнцыялам, функцыяй адлюстравання ўзаемасувязей навукова-адукацыйнага комплексу валодае і персанальная бібліяграфічная інфармацыя ў яе нярэчыўным (электронным) выяўленні – персаніфікаваных базах даных. Працуючы з персаніфікаванымі базамі даных, даследчык атрымлівае магчымасць не проста доступу да вялікага масіву структураваных даных у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

машыначытальным выглядзе, але і магчымасць ствараць у гэтай структуры ў любой форме любую колькасць сваіх структур, арыентаваных на рашэнне ўжо канкрэтных даследчых задач. Так, напрыклад, праводзячы пошук у персаніфікаванай базе даных "Навука Беларусі ў асобах" Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, магчыма на аснове аналізу і сінтэзу атрыманых даных вызначыць поспехі развіцця той або іншай навукі, галіны дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, прасачыць за гісторыяй развіцця беларускай навукі, вывучыць уклад таго або іншага навукоўца ў развіццё навукі, а таксама атрымаць фактычныя даныя аб яго жыцці і дзейнасці. Падобныя даследчыя задачы можна вырашаць у базах даных "Беларусь у асобах і падзеях" (Нацыянальная бібліятэка Беларусі), "Беларускія алімпійцы" і "Беларускія паралімпійцы" (бібліятэка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры), "Біябібліяграфія навукоўцаў НАН Беларусі", "Біяграфіі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі", "Біяграфістыка НАН Беларусі (кароткія біяграфічныя звесткі аб навукоўцах НАН Беларусі)" – базы даных Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Такім чынам, персанальную бібліяграфічную інфармацыю можна лічыць шматфункцыянальным бібліяграфічным прадуктам, які, акрамя агульнапрынятых функцый, выконвае спецыфічныя функцыі: гісторыка-культурную, крыніцазнаўчую, функцыю адлюстравання ўзаемасувязей навукова-адукацыйнага комплексу. У цэлым персанальная бібліяграфічная інфармацыя валодае велізарным функцыянальным патэнцыялам, і ёй могуць быць уласцівы столькі функцый, сколькі можна выдзеліць сацыяльна значных груп карыстальнікаў, задач, якія яны ставяць перад сабой. Сярод іх трэба адзначыць функцыю сацыялізацыі, эўрыстычную і нават геданістычную функцыі.

Адраджэнне і зберагание нацыянальнай памяці, выхаванне маладога пакалення – найбольш важныя задачы, якія стаяць перад дзеячамі сучаснай айчыннай культуры. Вучоныя, краязнаўцы, даследчыкі, бібліёграфы і ўсе тыя, хто ганарыцца гісторыка-культурнай і навуковай спадчынай сваёй краіны, паступова прыходзяць да асэнсавання неабходнасці вывучэння жыцця і дзейнасці грамадскіх дзеячаў, дзеячаў навукі, культуры, адукацыі; стварэння персанальных бібліяграфічных манаграфій аб іх, а таксама шматперсанальных дапаможнікаў. Вядома, што кульмінацыяй прызнання значнасці дзейнасці чалавека перад нацыяй і нацыямі іншых краін служыць з'яўленне асобнага кірунку навуковай дзейнасці, напрыклад Пушкініяны ў Расіі, Скарыніяны ў Рэспубліцы Беларусь. Без лоцыі, або без біябібліяграфічнага забеспячэння, паспяховае развіццё любога кірунку марудзіцца. Наяўнасць персанальнай бібліяграфічнай інфармацыі, разуменне яе функцыянальнага патэнцыялу, эфектыўнае шматаспектнае выкарыстанне з мэтай генерацыі і распаўсюджання комплекснай інфармацыі аб чалавеку як суб'екце і аб'екце культуры, выхавання сапраўдных грамадзян сваёй краіны – выразны барометр адносін грамадства да дасягненняў чалавека і дзяржавы.


1. *Дружкин, Ю.* Функциональный потенциал искусства [Электронный ресурс] / Юрий Дружкин. – Режим доступа : http://druzus.narod.ru/FPI.htm. – Загл. с экрана.

2. *Коршунов, О.П.* Проблемы общей теории библиографии: монография / О.П. Коршунов. – М., 1975. – 191 с.

3. *Непомнящий, А.А.* Востоковедение как направление развития крымоведческой библиографии (XIX–первой трети XX века) [Электронный ресурс] / А.А.Непомнящий. – Электрон. данные. – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2005/disk/199.pdf. – Загл. с экрана.

4. *Сальникова, Л.И.* Биобиблиография как метод изучения истории библиотечного дела [Электронный ресурс] / Л.И.Сальникова. – Электрон. данные. – Режим доступа: http://liber.rsuh.ru/Conf/ Library1997/salnikova.htm. – Загл. с экрана.

5. *Соколов, А.В.* Социальные функции библиотечной и библиографической деятельности / А.В.Соколов // Научные и технические библиотеки СССР. – 1984. – № 6. – С. 22–23.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Юсупов, Р.М.* Наука, образование и проблемы национальной безопасности / Р.М.Юсупов // Проблемы деятельности ученого и научных коллективов: междунар. ежегодник. – СПб: Нестор, 2000. – Вып. 15. – С. 14–25.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ